Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 26 (55) Серада, 10-га жніуня 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць р... тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нац... ...е. — Тэрыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі ... з комунізмам.— Нацыянальная царква. - Краевая згода. - Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце . —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Наш адказ .

У момэнт, калі паўстала кіраваная тайнымі, комуністычнымі, закардоннымі агэнтамі, падбіваючая асновы Дзяржавы „Грамада“ і захапіла як цэнтры Зах. Беларусі, так і беларускую вёску, — адзінай арганізацыяй, якая фактычна і з пасьпехам змагалася з Грамадою, была Беларуская Нацыянальная Рада разам з сваім органам „Бел. Словам“.

Той, хто асабіста бачыў провінцыю ў той момэнт, хто бачыў разбушаваўшую народную стыхію,--толькі той можа зразумець, як цяжка было выйсьці змагацца там па глухіх вёсках з гэтай магутнай хваляй. Аднак-жа сябры Б. Н. Рады выйшлі, і выйшлі з праграмай умяркаванай, з праграмай не клясавай і нацыянальнай барацьбы і ненавісьці да Польскага Народу, а нацыянальнай і клясавай згоды і добрага сужыцьця Народаў Польскага і Беларускага. І ўжо праз некалькі месяцаў нашае „Бел. Слова“ пачало зьмяшчаць адразу цэлыя дзесяткі заяваў грамадаўцаў аб выхадзе з Грамады і аб далучэньні іх да Б. Н. Р., ці да „Прасьветы“.

У гэты момэнт у Вільні заснаваўся тыднёвік „Беларускі Дзень“. Тыднёвік гэты выразна зазьначыў сваё credo, як беларускае нацыянальнае, прыхільнае да Польшчы. Спосабамі правядзеньня сваей думкі ўзяў гаспадарчую і культурную працу. На чале часопісі стаў б. „нашаніўнік“ п. Ф. Ўмястоўскі.

„Бел. Дзень“, выходзячы ў працягу 6 месяцаў, вёў сваю працу спакойна і выдзеляўся з іншых часопісяў умяркаваным характэрам, заклікаючы заўсёды іншыя беларускія часопісі кінуць спрэчкі і лаянкі. Аднак-жа ці той факт, што п. Умястоўскі апошні дзесятак гадоў зусім не займаўся беларускай газэтнай працай і мала цікавіўся беларускім палітычным і грамадзкім жыцьцём, ці наагул бязлюдзьдзе ў беларускіх віленскіх інтэлігэнскіх сфэрах, — але падбор супрацоўнікаў п. Умястоўскага аказаўся фатальным.

Яму літэральна ня ўдалося здабыць аніводнага супрацоўніка, які, як незалежны чалавек, пайшоў-бы працаваць да яго, адначасна падзяляючы ідэалёгію „Бел. Дня“. П. Умястоўскаму ўдалося падабраць пару „спэцаў“, якіх беларускае грамадзянства бачыла ў самых рожных амплуа і ў самых рожных, часта варожых адна аднэй, арганізацыях.

Усе гэтыя супрацоўнікі ўкрываліся пад псэўдонімамі. Праўда п. Умястоўскі гэтых сваіх супрацоўнікоў трактаваў выключна, як наемных людзей, дзякуючы чаму толькі і можна было сярод людзей гэтак рожнай ідэалёгіі падтрымліваць дысцыпліну і субордынацыю, але затое з гэтага матэрыялу рабіць якую колечу грамадзкую, ці палітычную групу было-бы больш, як небясьпечна. Аднак-жа пры ўсей важнасьці і цікавасьці гаспадарчых задачаў, якія ставіў „Бел. Дзень“ перад сабою, у сялянства было яшчэ шмат іншых пытаньняў і балячак з жыцьця грамадзкага, культурна-асьветнага і палітычнага. „Бел. Дзень“ ня мог задаволіць і заспакоіць усіх гэтых вясковых балячак, і цікавасьць да яго ў сялянстве значна аслабла.

І вось мы бачым п. Умястоўскага ў новай імпрэзы: п. рэдактара — выдаўца песячніка „Беларуская Культура“.

Рэдакцыя ставіць сабе гэткія *задачы:* „гуртаваць усе жывыя, творчыя сілы навокала ідэі адраджэньня Беларусі.....

Затым: „дрэнна робяць тыя, хто *блутаець ідэю* нашае *культуры*, ідэю вечную з бягучымі задачамі палітыкі і палітычнаю барацьбою, — а тым больш, з грызьнёю. *Гэтым яны выдаюць сабе атэстат на вельмі дрэнных палітыкаў*“ ... (курсіў нашы. Рэд.).

*) Да пратэсту 5 беларускіх палітычных культурных і грамадзкіх арганізацыяў.

Гэта ёсьць *праграма* „Бел. Культуры“. А вось як выглядае сама „культура“ ..

Зганьбіўшы абсалютна *ўсе* палітычныя групы і партыі, як на Усходняй Беларусі, так і ў Заходняй і ў эміграцыі, „Бел. Культура“ у гэтым зганьбеньні ўжывае спосабы, якія ўжываліся толькі бульварнай „Нашай Праўдай“, а апошнімі часамі „Сель-Нівай“ і *ніколі* іншымі прызваітымі *палітычнымі* газэтамі, як напр. бел. „Крыніца“ і інш.

„Культура“ пачала з заведамай ілжы і даносаў.

Вось кветачкі „культурнай“ працы „Б. Культуры“: „Паўлюкевіч, убраўшыся ў паляна фільскую вопратку, трымаець нейкую падазроную сувязь з расейскімі манархістамі і эміграntамі, а сваіх блізкіх супрацоўнікоў выхоўваець на расейскіх нацыянальных „гэрояў — патрыётаў“...

„Антыподам „Нашае Праўды“ зьяўляецца газэта „Беларускае Слова“, орган Паўлюкевіча. Газэта „Б. С.“, як і ус „група“ (чужа слоў рэд Б. Культуры!) Паўкюкевіча не зьвязана ані маральна, ані ідэйна ані з воднаю польскаю дэмократычнаю групаю, — хоць і лічыць сябе палянафільскай. „Палянафільства“ (чужаслоў рэд. Бэл. Культуры!) газэты штучнае, няглыбокае і няшчырае. Газэта больш цікавіцца расейскімі справамі, што асабліва яскрава выявілася ўва ўсей справе Кавэрды. Змагаючыся з камуністамі, газэта аднак вельмі прыхільна адносіцца да ўсякіх расейскіх партыяў“...

Мы — рэдакцыя „Бел. Слова“, просім і трэбуем рэдакцыю „Бел. Культуры“ даць доказы, дзе і калі „Бел. Слова“ „прыхільна аднасілася да ўсякіх расейскіх партыяў.“ Трэбуем указаць хаця бы адзін нумар, хаця бы адну строчку!

Што датычыць справы Кавэрды, дык да яе нашая газэта значна спакайней аднеслася, чым некаторыя польскія газэты, як, напрыклад, гэтак салідная і блізкая да ўрадовых сфэр, як віленскае „Słowo“. Думаем, што сымпатыя, якую выявіла „Słowo“ да Кавэрды, як ідэйнага антыбальшавіка, ні водны чэсны і разумны чалавек ня можа прыраўніваць да асобай сымпатыі да расейскіх праканаваньняў Кавэрды.

Што датычна закіду, што „палянафільства газэты штучнае, няглыбокае і няшчырае“, дык мы лічым, што шчырасьць кожнай групы і газэты вымяраецца чынамі і фактамі. І лічым, што гэтых фактаў і чынаў у „Бел. Слова“ больш, як трэба. Прывядзем хаця бы гэткія факты, як адкрытае выступленьне нашае газэты і сяброў Рады пад час выбараў Прэзыдэнта, калі *ўсе* іншыя беларускія групы былі у лагеры варожым су часнаму ўраду, факт сучаснага змаганьня з Грамадою, нарэшце факт *раўнага і сталага* прыхільнага аднашэньня да Польскага Народу, пачынаючы ад слуцкага паўстаньня і да сяньняшняга дня, ня гледзячы на частыя прыкрасьці з боку папярэдніх адміністрацыйных, школьных і іншых урадавых інстытуцыяў.

З свайго боку мы радзім пашукаць „шчырасьці“ і глыбіны тых ідэяў, якія мае праводзіць „Бел. Культура“ пану рэдактару ў сваіх асабістых супрацоўнікоў.

Урэшце думаем, што катэгарычны і аднагалосны протэст 5 бел. грамадзкіх арганізацыяў ёсьць лепшым адказам на ўсю беспадстаўнасьць закідаў нованароджанай „Бел. Культуры“ нам, правёўшым цяжкую баявую трохгадовую газэтную працу.

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

На пярэдні плян палітычных падзеяў апошняга часу выступае

англійска-амэрыканскае непаразуменьне,

пачаўшаеся ў Жэнэве і закончыўшаеся на нафце. Пасьля доўгіх і трудных гутарак жэнэўская конфэрэнцыя трох аб абмежаваньні марскіх вааружэньняў разьбілася аб няўступчывасьць Амэрыкі, якая не згадзілася на праэкт Англіі. І ў выніку гэтай конфэрэнцыі трэба чакаць не спыненьня выперадкаў у марскіх вааружэньнях, а наадварот — унізеньня тэмпу вааружэньня. Амэрыка прыгразіла, што ў выпадку няўдачы конфэрэнцыі яна асыгнуе на бліжэйшыя гады 400 мільёнаў даляраў на будову новых крэйсэраў і мінаносцаў, каб зраўняцца з Англіяй. І можна быць пераканаными, што яна, маючы неабмежаваныя запасы золата і надзвычайна разьвітую тэхніку выпаўніць гэтую пагрозу. А гэта ў сваю чаргу творыць напружанасьць палітычных адносінаў між Англіяй і Амэрыкаю, якія значна горшаюць яшчэ дзякуючы прымяшаўшамуся запаху нафты.

Нафта зьяўляецца цяпер тым прыцягацельным цэнтрам, навокала якога абварачываецца уся сьвятовая эканамічная палітыка.

З разьвіцьцем аўтамабілізму, авіацыі і пераходам пераходаў ад вугальнага апалу на нафтавы — будучыня належыць нафце, з якой выробляецца бэнзына, газа, масла для смазкі машынаў, мазут для апалу і іншыя прадукты. Амэрыка мае 16 мільёнаў аўтамабіляў. Там прыходзіцца адзін аўтамабіль на 6 чалавек насяленьня. Апрача гэтага распалагае найвялікшым пасьля Англіі марскім флётам і будуе магутны паветраны флёт. Усё гэта патрабуе неабмежаваных крыніцаў нафты, якая на выпадак вайны будзе гуляць яшчэ большую ролю, чым у спакойным часе. Маршалак Фош добра ацаніўшы ролю нафты ў вайне з немцамі сказаў, што **„у часе вайны кропля бэнзыны ня менш дорага, чым кропля чалавечай крыві“**. У Нямеччыне да гэтай пары многія прыпісываюць ваенныя няўдачы нястачы бэнзыны. Дзеля гэтага зусім зразумела, што прыймаючы пад увагу вопыт мінуўшай вайны і тэндэнцыі прамысловага разьвіцьця, вялікія дзяржавы пасьля вайны стараюцца па магчымасьці стаць незалежнымі ў вобласьці снабжэньня нафтаю. Найбольш упартая барацьба пры гэтым ідзе між Англіяй і Амэрыкаю. А цяпер, з разьбіцьцем марской конфэрэнцыі гэта барацьба прыйме яшчэ больш упарты характар. Даволі прыпомніць, якую настойчывасьць праяўляла Англія ў канфлікце з Турцыяй з-за Масула з яго нафтавымі крыніцамі, пакуль, нарэшце, не прыбрала гэтага смачнага кавалка да сваіх рук. З за нафты блізка што не разгарэлася нядаўна вайна між Амэрыкаю і Мэксыкаю, у якую ўмяшаліся-бы Англія і Японія, гэтак сама зацікаўленыя ў мэксыканскай нафце. Дзе-б не адбывалася якая небудзь міжнарадовая конфэрэнцыя, будзь гэта эканамічная ці нават палітычная, заусёды падымалася размова і аб нафце. На кожнай конфэрэнцыі за кулісамі яе вярцеліся нафтавыя тузы ці каралі, якія рабілі той ці іншы уплыў на ход конфэрэнцыі. І добра ведаючы, якую вартасьць мае нафта, бальшавікі заўсёды спакушалі каўказскаю нафтаю, на якую з зайздрасьцю паглядалі англійскія і амэрыканскія нафтавыя тузы. І ня можна сабе нават прадставіць, як яны цяпер радуюцца, што ім пашанцавала нарэшце пасеяць нязгоду між Англіяй і Амэрыкаю, спакусіўшы нафтаю найвялікшы ў сьвеце амэрыканскі нафтавы трэст Стэндарт Ойль і К-о, на чале якога стаіць нафтавы кароль мільярдэр Рокфэльлер! А дзеля таго, што гэты факт саўпаў як раз з момэнтам рашучай барацьбы Англіі з бальшавікамі, у якую вельмі пажадана было прыцягнуць і Амэрыку, англійска амэрыканскі спор з-за нафты здабывае вельмі важнае палітычнае значэньне агульнага характару.

Матывы англійска-амэрыканскага канфлікту наступныя: у Амэрыцы ёсьць магутны нафтавы сындыкат ці трэст Стандарт Ойль і К-о, у якім большасьць акцыяў мае мільярдэр Рокфэллер. Гэты сындыкат, аб'яднаўшы ў сябе ўсе амэрыканскія нафтавыя прадпрыемствы, у сутнасьці адналітны і выступае ў штаце Нью-Іорк і Нью-Джэрсі, як быццам дзьве незалежныя часткі. І вось, кары стаючысь гэтаю формальнаю незалежнасьцю, гэтыя дзьве часткі рокфэльлерскага трэсту нядаўна ўступілі між сабою ў палеміку па пытаньню аб савецкай нафце.

Справа ў тым, што нядаўна Стандард Ойль і К-о заключыла з радавым урадам умову, на моцы якой яна адтрымала права манапольнай прадажы радавай нафты на рынках Блізкага Усходу, Эгіпту і Індыі у ліку 100,000 тонаў у год. Умова заключана на 15 гадоў. Угода гэта тым балей скандальная, што яна

заключана пасьля разрыву англійска-радавых адносінаў і пасьля вядомага рашэньня амэрыканскай гандлёвай палаты.

Гэткім чынам з аднаго боку быццам спраўджаецца хвальба бальшавікоў аб тым, што Амэрыка ахвотна займе пустуючае мейсца у радавым вонкавым гандлі пасьля разрыву англійска-радавых адносінаў, на чым можа страціць толькі Англія, а з другога боку учынкі амэрыканскіх нафтавых каралёў ідуць у разрэз з апініяй амэрыканскага гандлёва-фінансовага сьвету і ўсей амэрыканскай нацыі і ўраду. Амэрыканская гандлёвая палата, яднаючая ў сабе ўвесь фінансавы сьвет Амэрыкі, нядаўна вынясла гэткую пастанову, якая, як громам аглушыла бальшавікоў:

— Амэрыканскі гандлёва—прамысловы сьвет пахваляе абраз дзейства свайго ўраду, ня прызнаючага радавага рэжыму, які аказаўся сыстэмаю бязупыннай тыраніі, ашуканства, ілжы, канфіскацыі ўласнасьці і зьнішчэньня асабістых правоў. Палата выражае сымпатыі расейскаму народу, але пераканана ў тым, што ня можна дайсьці да нармальных адносінаў шляхам гандлю, пакуль 140 мільёнавы народ будзе знаходзіцца пад неабмяжованай уладаю агідных, ілжывых і звар'яваўшых дыктатараў. Гандлёвая палата Злучаных Штатаў ня можа парадзіць амэрыканскім купцам гандляваць з палітычнаю групаю, трымаючайся сыстэмы прадаваньня за гатоўку, а пакупкі ў доўг з мэтаю дастаўкі фонду на прапаганду, якая імкнецца да зруйнаваньня істнуючых урадаў у іншых дзяржавах і узмацненьня ланцугоў бязгалосных мільёнаў уласнага народу

Пасьля гэткай пастановы гандлёвай палаты і пасьля таго, як у сьвятовай прэсе паявіліся весткі аб згодзе Стандард Ойль К о, між філіямі гэтай апошняй пачалася вельмі пікантная палеміка: нью-іорkская філія заявіла, што ніякай новай згоды з бальшавікамі пасьля разрыву між Англіяй і С.С.Р.Р. не рабіла, а толькі была прадолжана старая ўмова. А нью-джэрсэйская філія быццам абразілася за гэткія абвінавачаньні і заявіла, што і не думае аб згодзе з бальшавікамі,

пакуль яны не адплацяць аграбленых імі паасобных уласьнікаў і што не мае замеру прадаваць за граніцаю бальшавіцкую нафту, якую бальшавікі ў яе-ж укралі.

Гэткая заява левай паловы рокфэльлерскага сындыкату прадыктавана тым, што між гэтай філіяй Стандард Ойль К-о і англійска-голяндзкім нафтавым трэстам Рояль-Дэтч-Шэлл істнуе згода аб байкатаваньні савецкай нафты. У гэтую спрэчку ўмешалася бальшавіцкая прэса, вывёўшая на чыстую ваду як нью-джэрсэйскую філію, гэтак сама і Рояль-Дэтч-Шэлл. Аказваецца, што ў свой час як тая, гэтак і другая вялі перагаворы з бальшавікамі, толькі не згадзіліся на бальшавіцкія варункі і пасьля гэтага супольна забавяzаліся байкатаваць радавую нафту. А гэтым часам правая рука Рокфэльлера падпісала ўмову з бальшавікамі, якія сталі мягчэй пасьля разрыву з Англіяй і. каб насаліць Англіі, відочна пайшлі на вялікія ўступкі перад Рокфэльлерам, які можа аднаchасна і „капітал“ здабыць (у Нью-Іорку) і нявіннасьць саблюсьці (у Нью-Джэрсі).

Прадбачыць усе скуткі гэтай зачынаючайся барацьбы англійскага і амэрыканскага капіталу на грунце нафтавага канфлікту, які бязумоўна завострыць палітычныя адносіны між Англіяй і Амэрыкаю, пакуль не магчыма. Адно толькі можна без абмылкі сказаць, што ўвесь гэты скандал вельмі на руку бальшавікам, і што на гэтай Рокфэльлерскай згодзе шмат страціць павага і аўтарытэт Англіі і Амэрыкі ў Эўропе і Азіі.

N.

ПРАТЭСТ

5-ці арганізацыяу групы А. Паулюкевіча.

Пратэст Беларускай Нацыянальнай Рады.

Беларуская Нацыянальная Рада, выбраная зьездам Заходняе Беларусі, нясучая на сабе традыцыі слаўнага „Слуцкага паўстаньня„ за Вольнась Беларусі і праводзячая няўхібна наказ дадзены ей зьездам — Барацьбы за нацыянальнае адраджэньне Беларускага Народу і шуканьне шляху да паразуменьня і згоды Народаў Польскага і Беларускага,— выражае сваё зьдзіўленьне і абурэньне, і пратэстуе проціў безпадстаўнай, няўчцівай па зьместу і агіднай па форме акцыі новапаўсталага месячніка „Беларуская Культура“ проціў выбранага аднагалосна зьездам старшыні Рады п. А. Паўлюкевіча і групы на чале якой ён стаіць.

Безпадстаўныя, неэтычныя закіды „Бел. Культуры“ на неістнуючую сувязь п. Паўлюкевіча з монархічнымі і эміграцкімі расейскімі арганізацыямі Б Н. Р. лічыць недапушчальнымі пасквілям, прыраўнываючы яго,— прыймаючы пад увагу акцыю прасовую і дыплёматычную менскіх і маскоўскіх урадавых бальшавіцкіх сфэраў проціў п. Паўлюкевіча ў сувязі з працэсам Кавэрды—да даносу.

Бел. Нац. Рада, якая яшчэ нядаўна вяла змаганьне з рэвалюцыйнай антыдзяржаўнай работай Грамады, кіраванай менскімі камуністамі, палажыла ня мала высілкаў для наладжаньня польска-беларускай згоды і паразуменьня, якое было ў канец папсута тактыкай Бел. Пасольскага клюбу, а потым Грамадою і іншымі скрайне-радыкальнымі беларускімі арганізацыяў.

Адначасна з гэтым Б. Н. Р. лічыць патрэбным падкрэсьліць, што акцыя „Бел. Культуры“ ў гэткай форме можа ад'емна адбіцца на, з вялікімі высілкамі збудаваным, беларускім палянафільскім абозе, зложаным з цэлага раду палітычных, культурных і грамадзкіх арганізацыяў.

Віцэ-Старшыня

(—) *Я. Ярош.*

Сэкрэтар

(—) *Т. Вернікоўскі.*

ПРАТЭСТ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАРТЫІ.

У першым нумары месячніка „Бел Культура“, выдаваным і рэдагаваным рэдактар-выдаўцом тыднёвіка „Бел. Дзень“ п. Ф. Умястоўскім, зьмешчаны цэлы рад тэндэнцыйна — непраўдзівых інфармацыяў аб групе п. А Паўлюкевіча. Дзеля гэтага Бел. Нац. Партыя, здабываючая сабе з кожным днём усё новых прыхільнікаў сярод беларускіх масаў, аб чым яскрава сьведчаць факты пераходаў да Б. Н. Партыі ня толькі паасобных сябраў іншых партыяў, як „сель-саюзу“, „Вызваленьня“, Грамады і г. д., але нават цэлых групаў, як напр. група „Вызваленцаў“ на чале з акружным камітэтам (група Пятровіча), — рашуча пратэстуе проці агідных і безпадстаўных закідаў „Культуры“, якая замест лёзунга еднаньня беларусаў хацябы на культурным грунце, што было-б болей ёй да твару, з першага-ж кроку выступіла з неэтычнай лаянкаю на адрэсу ўсіх бяз вынятку беларускіх партыяў, у тым ліку і проці Б. Н. Партыі, як складавай часткі групы п. А. Паўлюкевіча. Гэты крок беларускай „Культуры“, замест аб'еднаньня Беларусаў на культурным грунце, аб чым увесь час крычэў „Бел. Дзень“ і гавора „Культура“, мог-бы толькі ўнясьці сумяціцу і раскол у найбольш умяркаваныя і чыста нацыянальныя групы і арганізацыі, лёяльныя і прыхільныя да Польшчы, на радасьць нашых ворагаў і на бязумоўную крыўду справе адраджэньня Беларускага Народу.

Віцэ-Старшыня

(—) *М. Пятровіч.*

Сэкрэтар

(—) *Я. Шыбка.*

ПРАТЭСТ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫБАРЧАГА КАМІТЭТУ.

„Беларуская Культура“ месячная часопісь п. Умястоўскага — рэдактара і выдаўца „Беларускага Дня“ распачала сваю „культурную“ працу звычайным шляхам „Сельсаюзніцкай“ і „грамадаўскай“ прэсы і без падстаўна кідае ў першым сваім нумары на нашую арганізацыю словы „банкруцтва“ і г. д.

Калі па думцы Бел. Нац. Рады створаны ў пачатку чэрвеня Бел. Нац. Выбарчы Камітэт, узяў на сябе справу дапамогі сялянам у выбарах да Гмінных Самаўрадаў,— тады—праўда - за адсутнасьцю часу, бо выбары павінны былі распачацца за 10 дзён і адсутнасьці патрэбных матэр'яльных сродкаў можна было спадзевацца, што з гэтае выбарчае акцыі нічога ня выйдзе.

Аднак-жа, паналёгшы на гэвую працу, Камітэт пасьпеў ня толькі ў свой час папярэдзіць сялянства аб выбарах, выпусьціўшы 2 выбарныя адозвы, ня толькі пасьпеў разаслаць ператтлумачаныя законы аб выбарах да самаўрадаў і аб самых самаўрадах, але вызначыўшы сваіх упаўнаважняных і больш 100 інструктараў на провінцыі, ў свой час разварушыў, зацікавіў і ўцягнуў у выбары агулам усё сялянства і сваіх сымпатыкаў, а нат і сваіх праціўнікаў, як „Сель-Саюзьнікаў“ і б „грамадаўцаў“. Бо ведама—нацыянальны фронт разьбіваць трэба, а інакш—барані Божа! — перавагу возьме п. Паўлюкевіч.

Вынікі выбараў па тым паветам, на якія Камітэт галоўным чынам зьвярнуў свае сілы і ўвагу, вось гэтакія:

МАЛАДЭЧАНСКІ ПАВЕТ.

(6 гмін) б. галоўн. сядзіба „грамадаўшчыны“ з 69 радных— 48 беларусаў, з іх толькі 2 „гуртоўцы“ 13 — палякаў і 8 жыдоў.

СЛОНІМСКІ (12 гмін)

З 188 радных — 108 белар. 20 палякоў і 6—жыдоў.

ВАЛОЖЫНСКІ (5 гмін)

З 52 радных - беларусаў—39, палякаў—12 і жыдоў -1.

НЯСЬВІСКІ (4 гмін)

З 42 радных—белар. — 30, паляк.— 11 і жыдоў—1.

НАВАГРАДЗКІ (3 гмін)

З 36 радных—белар. — 25, паляк. — 8 і жыд. — 3.

Хто чытае „Белар. Слова“ той заўважыў у кожным апошнім нумары асобную рубрыку пад загалоўкам „Першыя беларускія войты“. Пакуль што маем у Сіняўцы войтам Ант. Мілешкевіч. У Клецку—заступнік войта —А. Мікарэй, лаўнікам—П. Масейчык. У Красным — заст. воўта — Гр. Рован.

У Палачанах—войтам М. Пятровіч і заступнікам П. Шафаловіч. У Лебедзеве—заст. войта А. Божка і лаўнікам Рыгор Зячовіч. У Беніцы—заст. войта М. Бобрык.

У Радашкаўскай заст. войта Н. Дварэцкі. У Сабакінцах — заст. войта С. Барысэвіч.

У бягучым момэнце ідуць выбары да павятовых сэймікаў і мястэчковых магістратаў, куды гэтак сама пачалі пападаць беларусы, а уласьне:

У Сэймік Нясьвіскі выбраны гр. гр. Л. Краўчук, А. Шаўчык, Д. Рагальчык і Ігн. Дземеннік.

У Клецкі магістрат — 4 беларусы.

Гэтыя выбарныя амаль што ўсе цалком належаць да нашых арганізацыяў.

Дык паўстае пытаньне: дзе ж банкруцтва?!.. Ці ў нашых арганізаціях, ці ў мазгох аўтараў артыкулаў „Шлях да незалежнасьці Беларусі“ і ад „Нашай Долі“ да „Беларускае Культуры“?

Старшыня

Б. Друцкі Падбярэскі.

Заступнік

Г. Канапацкі.

ПРАТЭСТ БЕЛАРУСКАГА Т-ВА „ПРАСЬВЕТА“

У вышаўшым на гэтых днях № 1 месячніка пад гучным н зовам „Беларуская Культура“, рэдагаваным п. Ф. Умястоўскім (ён жа рэдактар выдавец і газэты—тыднёвіка „Беларускі Дзень“), зьмешчаны паміж іншым артыкулы, „Шлях да Незалежнасьці Беларусі“ і „Ад нашай Долі“ да „Беларускай Культуры“. — Зьмест іх — агляд культурнага жыцьця Заходняй Беларусі.

Здавалася-б, што згодна з назовам і зьместам перадавіцы, агляд гэты падасьць аб'ектыўна і бестаронна, а галоўнае: зусім праўдзіва факты гэтага жыцьця. Бо-ж культура — гэта перш-наперш — імкненьне да праўды, сумленнасьць і карэктнасьць адносінаў, а пад сьцягам культуры нямашака месца ніякай партыйнай барацьбе і грызьне. На жаль ў памянёных артыкулах „Бел. Культуры“ п. Умястоўскага нічога гэтага не знаходзім. А форма, ў якой ён характэрызуе тых, хто не належыць да яго рэдакцыі (бо-ж нікога больш п. Умястоўскі за сабой ня мае) — папросту непрызваітая і зьяўляецца вернай адбіткай партыйнага змаганьня грамадаўска сельніўскага гатунку.

Як культурная арганізацыя, мы перш-на перш пратэстуем проці ўжываньня для партыйнага змаганьня і грызьні сьвятога назову „Культура“. Готэнтоўская этыка віленскіх „гора-культурнікаў“ ужо даволі і бяз п. Умястоўскага апэцкала самы назоў Беларускай Культуры. Яе выражаньні ў месячніку, прысьвячонаму нашай нацыянальнай культуры - лічым ня толькі прафанацыяй гэтай культуры, але проста провакацыяй яе, перад усім сьветам, даючы доказ абсолютнай някультурнасьці.

Не паможа тут самарэкляма і запэўненьні службы культуры „Jak cię widzą, tak cię piszą“ кажа польскае прыслоўе. Затым—пратэстуем проці несумленнасьці і ілжы ў адносінах да абрысаваньня дзейнасьці групы п. Паўлюкевіча і яе характару, прынамсі ў сэнсі запярэчаньня яе беларускасьці. Гэтае запярэчаньне - доказ спробы нейкага ўзурпіраваньня манаполіі на беларускасьць зусім у гусьце А. Луцкевіча, але ён і за „Белар. Днём“ п. Умястоўскага, як і за іншымі не прызнае права на беларускасьць. Скуль-жа тады ў п. Умястоўскага, гэтакі імпэт апэраваць катэгорыямі манарха ад беларускасьці?

Пэўне-ж нам ня трэба прызнаньня ані на беларускасьць, ані благаслаўленьне на працу п. Умястоўскага, які з гэтакім пасьпехам у працягу ўжо 6 месяцаў даказвае сваю поўную арганізацыйную імпатэнтнасьць у грамадзкай працы.

Маючы за сабой 64 вясковых і мястэчковых аддзелаў культурна-прасьветных з 57 бібліатэкамі—чытальнямі, 5 аматорскімі групамі і 7 спартоўнымі коламі пры іх,—мы не патрабуем нейкіх пахвал ад нікога, ня толькі ад п. Умястоўскага, як роўна і сьцьвярджэньня шчырай беларускасьці нашай працы.

Але мы пратэстуем проці несумленнасьці і яўнай няпраўды самахвальцаў з „Бел. Культуры“ і ўважаем, што выступленьне проці нас, уваходзячых у групу п. Паўлюкевіча, як ілжывае па сутнасьці і непрызваітае па форме, якая, даючы як найгоршую атэстацыю „культурнікам“ з „Бел. Культуры“, пэцкае пекны сьцяг, падняты месячнікам.

Старшыня Ураду Т-ва „Прасьвета“

(—) *А. Якімовіч.*

Сэкрэтар (—) *М. Станкевічанка.*

ПРАТЭСТ

СЯБРОУ І ПРАЦАУНІКОУ БЕЛАРУСКАЙ „ХАТКІ“ У ВІЛЬНІ.

Мы сябры „Хаткі“ ў ліку 59 асоб і служачыя працаўнічкі і працаўнікі ў ліку 34 асоб пратэстуем проці безпадстаўнага нападу ў „Беларускай Культуры“ на нашыя арганізацыі.

Ад імя сяброў беларуская вучыцелька
М. Чыжэўская.

Ад імя працаўнічак
К. Кахановіч.

Ад імя працаўнікоў б. рэдактар „Сялянскае Нівы“
Л. Міцька.

Ад Цэнтр. Выб. К-ту.

Першыя беларускія войты.

(Працяг).

МАЛАДЭЧАНСКІ ПАВЕТ
РАДАШКОВІЦКАЕ ГМІНЫ.

Войтам выбраны Нікадзім Дварэцкі.

ГМІНА ЛЕБЕДЗЕУСКАЯ.

Заступнікам войта — Александр Божка. Лаўнікам—Рыгор Зяновіч, сябра „Прасьветы“

ГМІНА БЕНІЦКАЯ.

Заступнікам войта — Мацей Бобрык.

ГМІНА САБАКІНЦЫ.

Войт — Адам Блошка. Заступнік войта— Сьцепан Барысевіч, сябра „Бел. Хаткі ў Вільні“.

Тлумачацца...

Уся без вынятку прэса, як беларуская, гэтак і польская канстатавала скандальны правал конфэрэнцыі Рагуль—Ярэміцкага „Сель-Саюзу“ (Нават „Крыніца“ — гэта заўсёдашняя пакрав'целька „Сель-Саюзу“, не напісала ад сябе ні слова, апрача бязкрытычнай хранікёрскай зацемкі ў 9 радкоў, бо праўду пасаромілася напісаць, а няпраўды не хацела), на якую пасьля *двух гадоў* „працы“ зьявілася ажно 9 (выразна дзевяць) дэлегатаў, у большасьці маладых хлапцоў, б. курсантаў каапэратыўных курсаў.

Гэты правал прызнала неспадзеўкі нават сама „Сельніва“ у № 58, канфузьліва *тлумачучы* прычыны правалу конфэрэнцыі тым, што яна адбывалася „у цяжкую (для правадыроў! Рэд.) і нязручную пару“, што гэты час гэтакі самы рабочы, ён зьяўляецца і самым цяжкім матэрыяльна“... і г. д. і г. ц.

Аб чым тут шмат гутарыць?

Канфэрэнцыя — не пажар, і тэрмін вызначалі самі правадыры. Грошаў было колькі хочаш, бо *усіх* дэлегатаў добра аплацілі, даючы нават па 50 зл. за прыезд на „конфэрэнцыю“! Хапіла грошаў і на добры абед з гарэлкаю! І толькі не хапіла... дэлегатаў!..

Дык што тут „тлумачыць“?...

Праўда у тым-жа № сваей Нівы, у якім саюзьнікі *тлумачаць* свой правал, яны у „адчоце“ аб конфэрэнцыі пішуць, што яна прайшла надта добра?!... і падаюць фальшаваныя лічбы...

Гэтак „Сель Ніва“ піша, што дэлегатаў было з вёсак ажно 22 (?!) Гэта няпраўда! Нехай „Сель Ніва“ *падасьць прозьвішчы* гэтых мёртвых душ і адкуль гэтыя мёртвыя душы паходзяць!... Затым „С.-Ніва“ піша, што „дэлегаты былі амаль што ад усіх паветаў Зах. Беларусі, выключаючы Пінскі і Лунінецкі“.

Гэта так сама няпраўда, бо незапярэчаным фактам ёсьць відомая ўсім заява п. Гардзея, *адзінага* дэлегата з Маладэчанскага павету, які адмовіўся ехаць, не гледзячы на запэўненьня „звароту“ падарожных расходаў.

Дык гэткія відаць „праўдзівыя“ і ўсе іншыя лічбы, якія падае „Сель-Ніва“.

Дык аб правале конфэрэнцыі хіба няма чаго гаварыць.

Што датычна моральнага ўплыву (бо фізычную вартасьць даказалі 9 дэлегатаў!...) Сель-Саюзу на сялянства, дык найляпей аб гэтым гаворыць друкаваная вышэй дэклярацыя п. Гардзея, гэтага быўшага *сябра* Сель-Саюзу, і быўшага *мужа даверра і дэлегата* Саюзу на конфэрэнцыю ад цэлага Маладэчанскага павету!

ДЭКЛЯРАЦІЯ

„Сэль-Саюзьніка“ аб прылучэньні да Беларускай Нац. Рады і Партыі.

Браты Беларусы!

Вітаю Вас, як быўшы сябра Беларускага Сялянскага Саюзу. Ідучы за „Сель-Саюзам“, я глыбока верыў у гэтую партыю і яе шырока размалёваную праграму. Селяніну зямлю бяз выкупу, школу ў роднай мове, дый яшчэ сярэднія вышэйшыя школы безплатна, і бараніць інтарэсы Беларускага селяніна. Аднак-жа пекная праграма Беларускага селянскага Саюзу ня вельмі шмат дзейнасьці выказала ў беларускім сялянстве. Сель.-Саюз меў двух сваіх паслоў у Сойме. Але-ж яны памаглі беларусу, як кашаль у хваробе: ня толькі не абаранілі балячкі Беларускага сялянства, але яшчэ горш пашкодзілі, разсылаючы дарма свой орган „Сялянскую Ніву“, якая абрэхівае Беларускія партыі, а перад усім Б. Н. Р. і такім шляхам прабуюць разьбіць сялянства на групы, і адвясьці ад праўдзівае дарогі. Калі паслы прабылі 5 гадоў у Сойме, яны ня толькі зняверыліся Беларускаму сялянству, але свайму Сель Саюзу. Тады мы павінны зразумець, што калі павадыры самі з сабой грызуцца, дык ім некалі думаць аб сялянстве і бараніць інтарэсы яго,

Паны паслы Беларускага Сялянскага Саюзу! Радзім Вам пакінуць нас баламуціць і ашуківаць, бо бачым здраднікаў сялянства, і радзім Вам лепш ідзіце з сваім саюзам у Прагу, дзе ён радзіўся, і там працуйце. А нас на роднай Бацькаўшчыне не ашуківайце. Мы бяз Вас знойдзем праўдзівую дарогу, а гэтую дарогу нам паказвае нашая родная, чыстая, нацыянальная, беларуская Партыя.

І заклікаю ўсіх шчырых сябраў Беларускага Сялянскага Саюзу пакінуць здрадніцкі Сель Саюз і гнаць вон правадыроў яе, каб не баламуцілі нашай вёскі і не ашуківалі сялянства. А трэба з'арганізавацца каля сваей роднай, легальнай арганізацыі Бел. Нац. Рады і Партыі і стаць пад адным Нацыянальным сьцягам. Калі толькі з'арганізуемся каля Беларускай Нацыянальнай Рады і Партыі, тады даб'емся палепшаньня нашага цяжкага сялянскага жыцьця. Гэта пракананьне тым мацней, што мы верым Маршалку Язэпу Пілсудзкаму, які стаіць на чале дзяржавы і дзякуючы чаму нашая і іншыя гміны ўжо маюць сваіх першых беларускіх войтаў, і мы пэўны, што скора будзем мець сваю беларускую аўтаномію.

Дык няхай жыве Польшча!
Няхай жыве Маршалак Пілсудзкі!
Няхай жыве Бел. Нац. Рада і Партыя!
Няхай жыве Беларускі Народ!

Сябра Беларускага Сялянскага Саюзу, з вёскі Літвы, Палачанскай гміны, Маладэчанскага пав.

Антон Гордзеў.

1. VII. 1927 г.

У МУТНАЙ ВАДЗЕ.

Амэрыканская гандлёвая палата адхіліла прапазыку Лі аб адкрыцьці аддзяленьня палаты у Маскве.

(З газэтау).



Асьцярожва, містэр Лі! Гэтая рыбка можа праглынуць ня толькі ваш кручок, але разам з ім вас і мяне.

Пашырайце роднае слова!

Апошнія навіны.

З Польшчы.

Пасланнік Патэк зноў у Варшаве.

2 жвіўня зноў прыехаў да Варшавы польскі пасланнік у Маскве Патэк і меў другую конфэрэнцыю з старшынёю Рады міністраў маршалкам Пілсудзкім. Пасланнік Патэк зрабіў даклад аб выніках сваіх перагавораў з урадам С. С. Р. Р., якому ўручыў польскую ноту з адказам на ўсе радавыя ноты, выслaныя ў зьвязку з забойствам пасла Войкава. Апрача гэтага ён прывёз вынікі перагавораў з Чычэрыным і Таманьяковым аб абнаўленьні польска-радавых гандлёвых перагавораў і аб гарантыйным пакце.

Спатканьне Патэка з Стаманяковым.

6 жвіўня праз Варшаву праяжджаў сябра калегіі народнага камісарыяту заграгічных справаў Стаманякоў. Яго спаткаў на вакзале польскі пасланнік у Маскве Патэк, меўшы з ім кароткую конфэрэнцыю. Патэк выяджае да Масквы.

Поўная адмена numerus clausus.

Камісія экспэртаў пры палітычным камітэце рады міністраў, абгаварываючы numerus clausus, выказалься за адмену ўсялякіх нацыянальных і веравызнаўчых абмежаваньняў пры прыйме студэнтаў да вышэйшых школаў. Міністар асьветы ўжо выдаў адпаведны цыркуляр.

Безрабоцьце у Польшчы.

У часе ад 23 да 31 ліпня лік безработных у Польшчы паменшыўся на 4,272 чал., а агульны лік паменшыўся да 148,272 чал.

ЗЛАДЗЕЙСКІ ПАДКОП ПАД КАСУ З 6 МІЛЬЕНАМІ ЗЛОТЫХ.

Варшаўская паліцыя зьліквідавала шайку небясьпечных зладзеяў. Яна была накрыта у той момэнт калі зьбіралася закончыць будову падземнага ходу пад гмах дзяржаўнага графічнага інстытуту, дзе выраблялiся грашовыя знакі Польскага Банку. Падземны ход меў 20 мэтраў удаўжкі і быў абарудаваны па ўсім правілам тэхнікі — электрычным сьвятлам, вэнтылятарамі, падлогаю і г. д. Ход закачываўся пад пакоем касы, дзе ў гэты момэнт знаходзілася 6 мільёнаў зл. Арыштавана 6 вучасьнікаў шайкі, з якіх адзін пры адпоры паліцыі быў сьмяротельна ранены.

ПЕРАВЯЗЕНЬНЕ БАРЫСА КАВЭРДЫ ДА ГРУДЗЕНДЗА.

У пятніцу 29 ліпня Барыс Кавэрда пад моцнаю ахранаю быў перавезяны з сьледчай турмы ў Варшаве да угалоўнай турмы ў Грудзёндзы, дзе будзе адбываць кару.

З Заграніцы.

Пралетарскі алярм.

У Амэрыцэ, у Штаце Мэсачузэт былі асуджаны судом прысяжных заседацеляў на сьмерць два італьянскіх анархісты замахоўцы Сако і Ванцэці. Губэрнатар падтрымаў апінію суда прысяжных і адхіліў просьбу абароны аб памілаваньні. У зьвязку з гэтым камуністыя „ўсіх страв“ паднялі нязвыклы алярм і выступілі з масавымі пратэстамі.

У Парыжу ў часе дэманстрацыі камуністаў дайшло да спатычкі між дэманстрантамі і паліцыяй. Шмат асобаў ранена. Гэтак сама і ў Бэрліне камуністы арганізавалі дэманстрацыю, якая скончылася спатычкаю з паліцыяй. І гэта „пралетары ўсіх стран“ паднялі гэткі алярм, у той час, калі ў Расеі ад рук чырвоных катаў кожны дзень гібнуць дзесяткі, нават сотні зусім нявінных ахвяраў.

БОМБАВЫЯ ЗАМАХІ ў ЗЛ. ШТАТАХ.

5 жвіўня нявыкрытыя асобы кінулі 4 бомбы, з якіх адна ўзарвалася на падзёмнай дарозе ў Нью-Ёрку, раніўшая 12 чалавек, а другая ў пратэстанскай царкве ў Філядэльфіі. Улады мабілізавалі ў Нью Ёрку 14,000 паліцыі з мэтаю раскрыцьця праступнікаў. Замахі гэтыя знаходзяцца у сувязі з асудам на сьмерць 2 анархістаў.

АГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА ў АРГЭНЦІНЕ.

Гэнэральная забастоўка ў Аргэнціне, аб'яўленая ў знак сымпатыі для Сако і Ванцэці, пашыраецца. Адначасна адбываюцца маніфэстацыі. Кінуты дзьве бомбы, адна перад вядомаю фірмаю аўтамабіляў у Буэнос-Айрэсе, а другая на жал.-дарожны тор.

„АНТЫКАМУНІСТЫЧНАЯ СОТНЯ“ ў БРАЗЫЛІІ.

Палата дэпутатаў прыняла 118 галасамі проці 18. Закон аб энэргічнай барацьбе з камунізмам.

Ня хочуць гандляваць з бальшавікамі.

У Рызе адбылося паседжаньне прадстаўнікоў гаспадарчых і прамысловых арганізацыяў Латвіі, на якім аднагалосна пастаноўляна прадставіць да Сойму рэзалюцыю паседжаньня проціў заключэньня гандлёвага дагавору з радавым урадам.

АМЭРЫКАНСКІ МАНІФЭСТ ДА РАСЕЙСКАГА НАРОДУ.

„Таймс“ нядаўна павед міў, што ўрад Злучаных Штатаў мае замер у бліжэйшай будучыне зьвярнуцца з асобным маніфэстам да расейскага народу. Гэта вестка пацьвярджаецца і з другіх крыніцаў. Паводле гэтых інфармацыяў у маніфэсце будзе адмечана, што ўсе народы жадаюць павароту расейскага народа да сямьі іншых культурных народаў і што перашкодаю да ўзнаўленьня правідловых гаспадарчых і культурных адносінаў з Расеяй зьяўляецца радавы ўрад. Толькі ўрад правамоцны можа гаварыць ад імя ўсяго расейскага народу і выпаўніць гэта заданьне. Стварэньня гэткага ўраду зьяўляецца справаю расейскага народа.

СПАДЧЫНА КАРАЛЯ ФЭРДЫНАНДА.

Памёршы румынскі кароль Фэрдынанд заставіў сваім дзецям спадчыну, якая, апрача палацаў і маёнткаў, складае 300 мільёнаў лей гатоўтаю. На долю Прынца Карла, пазбаўленага права на прэстол, прыходзіцца 60 міл. лей.

КОМПАРТЫЯ.

„Камун'стычная партыя з яе надзвычайнай дысцыплінаю і салідарнасьцю ведае, што яна адзіная скупляная сіла ў Расеі“.
(Маскоўскі кар. „Абсэрвэра“)

— Яны гэтак скупляны, што іх немагчыма разлучыць!

Тройственны хаўрус.

Літоўская газ „Рытас“ паведамляе, што ў Коўне, у часе будучай візіты латвійскага міністра заграгічных справаў, будзе абгаварывацца пытаньне аб стварэньні тройственнага хаўрусу Латвіі, Эстоніі і Літвы. Да Коўны прыяжджае гэтак сама эстонскі міністар Акель.

Замардаваньне бальшавіцкага агэнта.

3 жніўня рэвельская паліцыя затрымала на вуліцы бальшавіцкага агэнта. Пачалася стрэлявіна, у часе якой агэнт быў забіты. Пры ім знойдзены паважныя дакумэнты, на падставе якіх арыштавана 4 асобы.

ТАЙНЫ ДАГАВОР?

Сэрбскія газэты паведамляюць, што быццам Вэнгрыя і Італія падпісалі тайны дагавор, паводле якога Мўсаліні забавязаўся зьвярнуць Вэнгрыі частку былой вэнгэрскай тэрыторыі. Далей газэты паведамляюць, што Малая Антанта ніколі ня згодзіцца на перагляд Трыянонскага трактату, як гэтага жадае Вэнгрыя.

Кітайская неразьбярыха.

Армія нанкінскага гэнэрала Шэка памысна наступаючая на Пэкін, пацярпела паважную няўдачу ў баях з арміямі хаўрусьнікаў Чанг-Тса-Ліна, Чанга і Фанга. Становішча Шэка стала крытычным. Вайска яго знаходзіцца ў пасьпешным адступленьні. Вайска Фанга прыбліжылісь на 100 кілямэтраў ад Нанкіна, адначасова і ханькоўская армія заварушылася. Усе гэтыя арміі імкнуцца відочна раней захапіць Шанхай, які зноў становіцца цэнтрам унутранай вайны.

ЗГАДЖЭНЬНЕ МІЖ НАНКІНАМ І ХАНЬКОЎ.

У Ву-Гу дайшло да згаджэньня між арміяй ў Ханькоў і вайскамі Шэка, дзеля чаго апошнія ў бліжайшыя дні вернуцца да Нанкіна

СТЫХІЙНЫЯ КАТАСТРОФЫ ў КІТАІ.

Навадненьне ў Індыі ракі Фуланга, выкліканае землятрасеньнем, абхапіла 7 правінцыяў. Затанула 12,000 чал. Матэрыяльныя шкоды дасягаюць 8 мільёнаў фунт. штэрлінгаў.

Выліў рэк у Індыі пашыраецца. Места Барода абрэзана ад акружаючага сьвету. У ваколічных вёсках згінула больш 1,000 чалавек. Жалезна-дарожны рух у местах вылева рэк зусім застанавіўся. Ураджай зусім зьнішчаны.

ЗЕМЛЯТРАСЕНЬНЕ ў ЯПОНІІ.

У Паўночна-Заходняй Японіі адчувалася вельмі моцнае землятрасеньне, якога ня было ў працягу апошніх 30 гадоў. Жалезна-дарожная і тэлеграфная сувязь пярэрвана. У месьце Фукушыма разбурана шмат дамоў. Землятрасеньне адчувалася і ў Іокагаме.

КОЛЬКІ ІНАСТРАНЫХ САЛДАТАЎ У КІТАІ?

Агульны лік жаўнераў, якія знаходзяцца ў даны момэнт у Кітаі, дасягае 100,000 чал.

У чырвоным пекле.

НАСТРОЙ ў С. С. Р. Р.

Бэрлінскі карэспандэнт добра асьвядомленага ў бальшавіцкіх справах „соц. Весьніка“ піша з Масквы, што ў Расеі з кожным днём жыцьце становіцца трудней. Гэта незадаволеннасьць палажэньнем заметна як сярод работніцкіх мас, гэтак сама сярод інтэлігэнцыі, урадоўцаў і сялянства. Найбольшую войстрасьць прыняло пытаньне аб безрабоцьці. Ідуць на ўсялякія хітрыкі, каб толькі пазбавіць безработных сацыяльнай запамогі. Даволі безработнаму атрымаць хоць самы незначны пабочны заробак, як ён зьнімаецца з ліку безработных. А безрабоцьце ўсё расьце і пераваліла за два мільёны безработных. А палажэньне безработных безнадзейнае. Пазбавіўшысь працы німа ніякай магчымасьці пралезьці ў якую небудзь шчыліну і знайсьці сабе новую працу. Дні і ночы праходзяць пад знакам лютага тэрору. Вобыскі, арышты, растрэлы!.. Тэрор прыцісьнуў усіх да акрайнасьці. Ня толькі баяцца разгаварываць, — думаць баяцца, а тэлефону баяцца, як нейкай пасткі. За атрыманьне звычайнага пісьма з заграніцы арыштовываюць, як за „сношэньня з заграніцаю“. Бражэньне па фабрыках ня ўціхае. Пашыраецца забастовачны рух у фабрычных раёнах. Усё гэта на руку апазыцыі, якая маніцца выкарыстаць агульную незадаволенасьць проці Сталіна. Аўтарытэт апазыцыянэраў павялічваецца. Пры гэткім агульным настрою зрокі ўсіх скіраваны на чырвоную армію. Але і яна ня зусім пэўна. Падымаецца нават пытаньне: Троцкі ці Варашылаў. З мэтаю адцягнуць армію ад унутраняй партыйнай клутні падняты цяпер шум аб неунікнёнай будучай вайне і аб наступленьні ўсей Эўропы проці С. С. Р. Р. Гэткі самы хаос у радавых інстытуцыях. Ніхто ня ведае, што будзе заўтра, чаго хоча „начальства“. Усе пляны мяняюцца кожны дзень. І уся праца тоне ў моры слоў і паперовай перапісцы. А тут яшчэ на нядобрае выступілі украінскія самастойнікі, паўстаньні на Украіне і Беларусі і белы контр тэрор. У Петраградзе быў узарваны гмах падчас паседжаньня камуністаў, пад грузамі якога згінула 100 чалавек. Бальшавіцкія газэты кожны дзень зьмяшчаюць нэкралогі замардованых партыйных работнікаў.

Дынамітавы замах у Петраградзе.

Нявыкрытыя замахаўцы падлажылі пад гмах у Петраградзе, ў якім адбываліся паседжаньне цэнтральнага камітэту камуністычнай партыі, надзвычайнай сілы дынамітавы зарад. Гмах разбурыўся, пахараніўшы пад грузам больш 80 выдатнейшых камуністычных дзеячоў. У суседніх дамах павылеталі ўсе шыбы, дзьверы і ваконныя рамы пазрывала з завесаў. Шмат асобаў ранена. У месьце наступіла паніка. Усе чакаюць рэпрэсыяў з боку Г. П. У. Радавыя ўлады зусім ізалявалі Петраград, акружыўшы горад кардонам войска. Бальшавіцкія ўлады стараліся скрыць гэту вестку, але яна пранікла да Масквы і адсюль з бліскавічнай хуткасьцю распаўсюджылася.

ВААРУЖЭНЬНЕ РАДАЎ.

З Масквы паведамляюць, што камісія працы і дзяржаўнай абароны ўхваліла пачаць у працягу наступнага году павольную будову ў Расеі 16 новых фабрык гармат і амуніцыі. Прыцягнуты будуць спэцыялісты з Расеі і заграніцы. Адпаведныя сумы для гэтага ўжо асыгнаваны.

ЧЫННЫ АДПОР УЛАДЗЕ.

У Пяцігорску, у часе выкананьня прысуду над 6 былымі афіцэрамі, таўпа, кіраваная духоўнымі, прабавала адбіць прысуджаных. Атрад Г. П. У. залпам разагнаў таўпу.

Раяшнік.

(Агляд жыцьця нашага тутэйшага — выданьня самага навейшага).

Паважаныя паны і паночкі, залатыя грабушочкі
і беларускіх справаў дзеячы і магнаты, і тыя, што маюць мандаты.
Ня свойскія?!..
А пасольскія!
Зьбірайцеся, налятайце!!. Знаёмых сваіх апазнавайце!!.
Восць, як із Ніла паўзе Кракадзіла.—
„грамада“ із тоўшчы сялянская, а баялі, што яна пралетарская...
Гэтак званая камуністая.
Ух, грамадзістая?!
Расла бяз меры і быццам ужо зьліквідаваная на паперы...
А „гурткі“ хоць і сьпяць, але дышуць...
Чакайма, што яшчэ нам прапішуць?!
А вось і „Сель-Саюз“ нумар першы — патэнтаваны і, як ведама, ўжо збанкрутаваны.
А складам аж з трох асоб!..
Вось тутака і стоп?!
Два гады на мейсцу таптаўся, пакуль не распаўся. Кідаўся ўлева, лазіў і ўправа — ня рушылася справа.
Тады палаяўся, пасварыўся і на 2 саюзы падзяліўся.
Гэта-ж ня жарты?!..
Ма быць павадыры нічога ня варты!..
А нумар другі, як і першы, завяў недасьпеўшы.
А пад гэты шумок —
Вось Базыля зямліца, а вось
Яромы дамок..
Лаўкачы?! Гэныя дзеячы?!
А вось вам і „Дзень Беларускі“, што небасхіл мае вузкі, а сымпатыкаў амаль што з пяток..
Крыху за мала, браток!.
А тэлефон, кабінэты, ўспаміны ў газэты, „цёплае“ мейсца ў куточку. —
І гэтага мала „паночку“!
Мо прыдзе твая шчэ пара?!.
Трымайся, каб не выгналі ўжо са „двара“...
А вось і Хатка — „каляровая“ —
Інстытуцыя ні старая і ня новая.
Павесіла на квінту нос, бо ліпень грошаў ня прынёс.
Час гурковы!..
Ні вулей мядовы?!
Ні пірагі імянінныя, авыбары гмінныя, дый і санацыі парастрасьлі ўсе асыгнацыі.
І хоць у хаткінскім скарбе і пуста, — за тое ў Радах беларусаў густа..
Маіш, кусьніся!..
Падзякуй, дый вынасіся.
А вось і Кавэрда Барыс, што за адвагу ўзяў прыз..
Пры іншай абставіне быў бы уласкавяны..
Памыліўся?!
Ні таму Богу памаліўся...
Нарэшце паны і паночкі, залатыя мае грабушочкі, пад палітычныя шуры, ды муры, забыўся зусім аб „культуры“ —
Аб новым журнале выданым і голасна так рэклямаваным.
Накручаным?!
Ілжой атручаным!..
А на абкладцы замест снапочку, ляпей зьмясьціць было бочку...
А з чым?!
Трэ' дагадацца самым..
Так-та „паночку“?!..
На гэтым паставім ўжо точку.
Бо што за „культура“ такая,
Што працу з ілжы і брахні пачынае.

Шэйнэ-Катарынка.

ВАЕННАЯ РАДА.

УНШЛІХТ (да Тухачэскаго, Будзеннага і палк. Каменева): што вашы манэўры? — Чэпуха! Я вучу стрэляць толькі па жывой мішэні.

Парахункі з Радаваю Уладаю.

У Нарыме замардаваны палітычным ссыльным Вашчэнка кіраўнік арыштна-распрэдзеліцельнага пункту былы чэкіст Кніповіч, адзначаўшыйся жорсткім абхаджэньнем з ссыльнымі. Другім выстралам Вашчэнка пакончыў з сабою. У вокругу Джанкой ў Крыму сяляне забілі кіраўніка акружной канторы па загатоўцы хлеба Міняўскага. У Харкаве замардаваны кур'ер Г. П. У. У Кізіль-Арваце замардаваны старшыня камуністычнага клюбу камуніст Трушкін.

ПАВЯЛІЧЫВАЮЦЬ ФЛЕТ... НА СЛОВАХ.

Пасьля аканчаньня манэўраў балтыцкага чырвонага флёту ваенны камісар Варашылаў выгласіў прамову, у якой заявіў між іншым, што палітычная сытуацыя пагоршэла, дзеля чаго рады павінны прадпрыняць энэргічна сродкі абароны берагоў проці магчымай атакі англійскага флёту. Кронштадт зьяўляецца авангардам радаў і дзеля гэтага для балтыцкага флёту будуць дадаткова збудаваны 4 крэйсэры, 3 мінаносцы і 7 падводных лодак.

Безрабоцьце сярод інтэлігэнцыі.

„Труд“ ад 12 чэрвеня падае рад даных, малюючых парадаксальнае становішча на рынку інтэлігэнтнай працы. Тут пануе вялізарнае безрабоцьце і побач з гэтым адчуваецца вялізарная нястача інтэлігэнтных сілаў. Калі ўзяць вобласьць тэхнікі, дык у С.С.Р.Р. спэцыялісты складаюць адзін процант агульнага ліку работнікаў, а той час, як за граніцаю гэты процант у 15 разоў большы. У ляснай прамысловасьці на 84 заводы ёсьць толькі 25 інжынэраў. У хімічнай прамысловасьці адзін „спэц“ прыходзіцца на 60 работнікаў, у той час, як у Нямеччыне прыходзіцца адзін спэцыяліст на 4 работнікі. У Іванова-Вазнясенскім тэкстыльным раёне безпасрэдня ў прадпрыемствах заняты ўсяго 4 інжынэры, а рэшта сядзіць ў канцэлярыі, урадах і г. д. У меснай прамысловасьці адзін інспэктар прыходзіцца на сто рабочых. Шахтамі у большасьці выпадкаў кіруюць студэнты-практыканты.

Сытуацыя становіцца тым балей грознаю, што па славам Лежавы на апошнем рэктарскім паседжаньні, „мы вычарпалі ня толькі аснаўны капітал нашых прадпрыемстваў, але мы вычарпалі інтэлектуальны капітал, насіцелямі якога зьяўляюцца старыя спэцыялісты“. Газэта ўказвае, што часта пры адбудове тых ці іншых галінаў прамысловасьці „пытаньне ўпіраецца не ў нястачу матэр'яльнай базы, а ў нястачу кваліфікаванага кадру кіруючага тэхнічнага пэрсаналю“. Пры гэткіх варунках вялізарная маса спэцыялістаў балтаецца бяз працы, а другія займаюцца пісьмаводзтвам. На 1 студня гэтага году па даным 173 біржаў працы С.С.Р.Р. было на вучоце каля 6,000 безработных спэцыялістаў.

Вось дык сацыялістычная гаспадарка!

Кіраўнік сэкцыяй Тэхносіл біржы працы паведаміў, што ў Петраградзе зарэгістравана 1,500 безработных інжынэраў і тэхнікаў. Апрача іх яшчэ ёсьць 700 безработных маладых інжынэраў і тэхнікаў — практыкантаў.

„КОНТ - РЭВАЛЮЦЫЯ“

У Кронштадзе пры вобыску ў памешканьні, дзе адбывалася нелегальнае сабраньне групы матросаў, у часе іх арышту завязалася перастрэлка, ў выніку якой быў замардаваны прадстаўнік Г. П. У., кіраваўшы вобыскам, два чырвонаармейцы з атраду Г.П.У. і ранена некалькі матросаў. На радава-фінляндзкай граніцы праізашла перастрэлка між агэнтамі Г.П.У. і групаю асобаў, прабаваўшых перайсьці граніцу. У часе перастрэлкі застрэляны камандзір пагранічнага атрада Г.П.У. Фадзееў.

Самагубства забойцы Цара.

У Харбіне павесіўся ведамы чэкіста Асіп Хазан, адзін з вучасьнікаў забойства Мікалая II і яго сямьі у Екатэрынбурзе. Да прыезду ў Харбін Хазан працаваў у кіеўскім Чэка і быў адным з забойцаў мітрапаліта Уладзіміра. За забойства цара Хазан быў нагараджаны ордэнам „Чырвонага Знамені“.

Бальшавікі задаволены.

Добра паінфармаваны ў савецкіх справах маскоўскі кар. „Бэрлінэр Тагэбл.“ паведамляе, што першы раз з часу разрыву дыплёматычных адносінаў між С.С.Р.Р. і Англіяй ў Маскве заметны больш аптымістычны пагляд на міжнарадовую сытуацыю Рад. Расеі, што галоўным чынам трэба прыпісаць пагоршыўшымся адносінам між Англіяй і Зл. Штатамі. Няўдачу жэнэўскай конфэрэнцыі, гэтак сама як і нафтавы канфлікт між „Стандард Ойлем“ і „Рояль—Дэйтчэм“ бальшавіцкія палітыкі лічаць доказам таго, што заўсёды прадсказываемы імі разлад між імпэрыялістычнымі дзяржавамі цяпер заўважыць можна заўважыць. Трэба чакаць, што радавы ўрад будзе ўважна сачыць за далейшымі труднасьцямі англійскага ўраду з тым, каб у адпаведны момант выступіць з сваімі прапазыкамі. У кожным разе не падлягае сумленьню, што ў партыйных колах гэта пытаньне ўжо абгаварываецца.

З Усходняй Беларусі.

ПАЎСТАНЧАСКІ РУХ У УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

З Масквы паведамляюць, што ў раёне Ігумена і на берагох Бярэзіны пазвіліся паўстанчаскія атрады.

НАПАД НА КАЙДАНАЎ.

У ночы з 31. VII. на 1. VIII каля першай гадзіны ў начы на кайданаўскі гарнізон напаў партызанскі атрад атамана Кліма. У працягу 30 мінут партызаны, карыстаючыся цямнатою і дажджом, захапілі касу стоячага там 39 батальёна, разаружылі батальён, забралі аружжа і аграбілі магазын амуніцыі. На старане бальшавікоў пазастала 10 забітых і некалькі раненых. Забіты батальённы палітычны камісар камуніст Каралаў і яго заступнік Максімоўскі. Старшыня кайданаўскага „рэўкома“ і прэзэс мейсцовага Г.П.У. Зэйдовіч, вядомы сваім зьверствам, схаваўся ў адным з суседніх дамоў і дзякуючы гэтаму ўратаваўся. Той час па выходзе з Кайданава партызанаў туды прыйшоў выкліканы другі бат. 39 палку і 2 роты міліцыі Г. П У., якія пачалі пакуль бясплодныя прасьледаваньні.

ЗАМЕСТ ШАЛЕНАЙ САБАКІ... ПАДСТРЭЛІЛІ ЧЭКІСТА.

31 ліпня сярод белага дня на вуліцах Менска зьявіўся шалёны сабака. У часе аблавы за сабакаю быў падстрэляны знахадзіўшыся на вуліцы чэкіста Шапіра. Цяжка раненага адвязьлі да шпіталя.

ЯШЧЭ АДЗІН.

Ў Менску на вуліцы быў замардаваны галоўны сэкрэтар ваенна сьледчага ўраду Беларусі Сенаў. Забойцы, сябры арганізацыі „Руская Праўда“ уцяклі.

Тутэйшая хроніка.

— ЗВАЛЬНЕНЬНЕ З АНТОКАЛЬСКАЙ ТУРМЫ ГЭН. ЗАГУРСКАГА. У мінуўшую суботу быў зволънены з віленскай ваеннай турмы на Антокалі гэн. Загурскі, арыштаваны у 1926 г. у зьвязку з маёвым пераваротам.

— СКАРГІ НА МЕЙСЦОВЫХ МОВАХ. Адтрыман цыркуляр міністра скарбу аб тым, што скарбовыя ўлады павінны прыймаць скаргі ад платнікаў падаткаў на мейсцовых мовах. Мейсцовую мовую ў Віленшчыне зьяўляецца для некатарых уладаў беларуская, а для другіх — літоўская. Скаргі напісаныя на жыдоўскай мове, нэ падлягаюць разгляду.

— ПАСЕЎНЫ КРЭДЫТ. У апошнія дні Дзяржаўны Рольны Банк вызначыў 3 мільёны зл. на акцыю засабленьня рольнікаў лепшым насеньням зярна на будучы год. Крэдыт выдаецца па вэксалях на карысных варунках. Тэрмін выплаты крэдытаў, ці тэрмін уплаты вэксаляў вызначан на 31 сакавіка 1928 г., а для мейсц пацярпеўшых ад катастрофаў — да кастрычніка 1928 г. Плата за крэдыт—10 проц. гадовых.

— ВЫСЫЛКА РАСЕЙЦАЎ З ПОЛЬШЧЫ. З ліку расейскіх эмігрантаў, пражываючых у Вільні, па загаду цэнтральнай улады высылаюцца у 6-ці дзенны тэрмін з Польшчы быўшы палкоўнік гэнэральнага штабу В. Гофман, быўшы афіцэр арміі Балаховіча П. Аксакаў, Зубкоў і Ермакоў. Матывы іх высылкі пакуль дакладна ня ведамы.

Жыцьцё правінцыі.

У Ш А

(Маладачанскага павету.)

24 ліпня г. г. у нашай вёсцы Уша было вясельле ў Дзямьяна Палянскага. Было запрошана шмат гасьцей, туды-ж прышоў няпрошаны з фальварку Уша Людвік Талік. Залезшы за стол без запрашэньня, напіўся гарэлкі, як сьвіньня і пачаў гаварыць саромныя словы. Схапіў са стала бутэлькі з гарэлкаю і кідаў іх на падлогу, як вар'ят. Затым выхапіў рэвальвэр са свэёй кішані і, прылажыўшы да грудзі Васіля Таўкача, пачаў крычэць, што застрэліць такога хамабеларуса, хаця В. Таўкач ніякага знаёмства ня меў з Л. Талікам. Перапалохаўшыяся госьці выбеглі ўсе на двор з хаты і ня ведалі, што рабіць з вар'ятам. Л. Талік убачыўшы, што ён адзін астаўся ў хацэ. Гэтак сама выскачыў на двор і пагнаўся за гасьцьмі. На вуліцы ён спаткаў каля варот Віткоўскага з Барапоўскім ня меўшымі ніякага знаёмства з Л. Талікам. Апошні напаў на Бараноўскага і ўдарыў яго некалькі разоў па твары, лаючысь апошнімі словамі. Пасьля ўсяго гэтага уцёк дасвайга маёнтку.

Вось, браты, як гуляюць і захоўваюць сябе паны інтэлігэнты—абшарнікі.

Сорам і ганьба.

Госьць Гіляры Усьціновіч.

Слонімская хроніка.

РЭВІЗЫЯ ў Слонімскім магістраце, на чале якого стаіць Клімовіч, вядамы апякун жыдоў, адбылася рэвізыя магістрацкай гаспадаркі. Пасьля гэтага, ваевудзкая ўлада прыслала „Komisarza rządowego“ п. Іванова.

ВЫБАРЫ Ў Слонімшчыне адбываюцца цяпер выбары войтаў, і іхніх заступнікаў, лаўнікаў і прадстаўнікоў да сэйміка.

КРЭДЫТ з „funduszów“ Мініст. земляроб. Есьць асыгнавано на Слонімскі павет 32,000 залат. для пацярпеўшых ад градабіцьця.

ПАЗЫЧКІ земляробскіх машынаў будуць у хуткім часе зарганізованы ў Слоніме, Бытэні, Казлоўшчыне, Дзярэчыне, і інш пунктах. За невялікую плату сяляне будуць мець магчымасьць пазычаць рожныя земляробскія машыны.

МАЛАЧАРНЯ. Апошнім часам у м Бытэні пачалі арганізаваць першую ў Слонімшчыне малачарню.—Цікава адзначыць факт, што „Wydział Powiatowy“ ў Слоніме адказаў адмоўна ў выдачы крэдытаў на гэту малачарню.

ПАЗЫЧКІ для бедных сялян на куплю жывёлы, пацярпеўшых ад стыхійных бедств ёсьць раздзелены гэтак:

1)	Дзярэчынская	каса атр.	17,000	зл
2)	Бытэнская	„ „	8,000	„
3)	Жыравіцкая	„ „	13,000	„
4)	Слонімская	„ „	14,500	„
5)	Кастровіцкая	„ „	8,000	„
6)	Міжавіцкая	„ „	7,000	„
7)	Дзрэвэнская	„ „	8,000	„
8)	Рагаценская	„ „	6,000	„
9)	Казлоўская	„ „	8,000	„

КАСЫ. Ў Чамерах, Дзевятковічах, і Курылавічах пачалася арганізацыя кас „Spółdzielczych“.

АРЫШТЫ маскоўскіх дэфэнзыўшчыкаў у Слоніме, г. е. цэлага штаба камігэту кам. П З. Б. правела паліцыя ў прошлую недзелю. У склад штаба выключна ўваходзілі і ёсьць пад ключом цяпер толькі жыды.

АРЫШТЫ На тэрытор. Міжавіцкай гміны паліцыя зрабіла вобыскі ў солтысаў у 1) в. Лапухова, 2) м. Кракотка, 3) Варонічы, 4) Пераналоцы. Рэзультат рэвізыі цікавы і багаты: чырвоныя сьцягі, маскоўска-жыдоўскія афішкі, камуністычная літэратура, цяпер солтысы ўпамянутых вёсак ёсьць у турме ў Слоніме. Шмат агэнтаў — шпікоў камуністычных ёсьць на беларускіх абшарах, якія за чырвонцы вешаюць сьцягі!.

Ў Слоніме з'арганізаваўся „Акружны Звёнзак Сялянскай Моладзі ў Слоніме“.

23. VII. ў вёсцы Клепачы, Міжавіцкай гміны, гром ударыў у хату селяніна, якога забіў. Хата спалілася. Таго жа дня спалілася ад грома гумноў в. Какошчыцы Чамерскае гміны.

Апошняй нядзелі ў Слонімшчыне пачаліся на добра жніва. — Беда толькі, што німа добрае пагоды.

25. VII. да Міжавіцкай „Касы Спулдзельчай“ прыехаў з Вільні люстратар кас. Пасьля люстрацыі,—якая выпала вельмі добра, люстратар сэрдэчна дзякаваў грам. Грэпачэўскаму за ідэйную працу над разьвіцьцем гэтай касы. Трэба адзначыць, што толькі дзякуючы гр. Грэпачэўскаму, — які зусім бязінтэрэсоўна вядзе рахункі гэтай-жа касы, — ёсьць магчымасьць развіцьця яе...

Славамір.

У С Я Ч Ы Н А.

Нацыянальны даход Злуч. Штатаў.

Амэрыканскае нацыянальнае бюро гаспадарчых досьледаў выдаўна апавясьціла наступныя даныя нацыянальнага даходу Злучаных Штатаў. 1913 г. — 32 мільярды даляраў, 1921 г.—62,7, 1922 г.—65,5, 1923 г.—76,7, 1924 г.—79,3, 1925 г.—86,4 і 1926 г.—89,7 мільярдаў дал. На аднаго чалавека насяленьня нацыянальны даход павялічыўся з 329 дал. у 1913 г. да 770 дал. у 1926 г. Нацыянальны даход Зл. Штатаў аказваецца ў 4 разы большы нац. даходу Англіі, які складаў у 1924 г каля 20 мільярдаў даляраў.

Паштовая скрынка.

Я. Г. Карэспандэнцыя Ваша ня можа быць зьмешчана, пакуль не пададзіце больш дакладнага адрэсу, які застанецца ў рэдакцыі.

Ар. Адамовіч, Ал. Руткоўскі, М. Грынко, П. Верута, П. Гурын, Кар. Хмара, Ант. Жданко, Б. Бруйко, Тэод. Крышлоф, Пав. Гарбачык, Арс. Мялевіч, Міх Андрэйчык, Сым. Махнач, Ан. Тольсціх, Фл. Паркоўскі. — пробныя нумары высылаем. Прысылайце грошы за падпіску.

Да Украінскіх Інвалідаў.

Украінскі Цэнтральны Камітэт падае да ведама ўсіх **інвалідаў** б. Арміі Украінскай Народнай Рэспублікі, якія адтрымалі інвалідзтва ў зьвязку з іх ваеннаю службаю ў гэтай арміі да 1921 г, незалежна ад іх дзяржаўнай належнасьці, што згодна з пастановаю Прэзыдэнта Польскай Рэспублікі ад 10 чэрвеня 1927 г. (Дэкр. Уст. з дня 18.VI. 1927 г. ч. 54, арт 475) **аканчальны тэрмін падаваньня заяваў** аб закваліфікаваньні іх на рэч адтрыманьня інвалідзкіх запамогаў **канчаецца** 18 чэрвеня 1928 г.

Заявы аб закваліфікаваньні трэба кіраваць з даводамі аб раненьні на ваеннай службе да Украінскага Цэнтральнага Камітэту (Варшава — Падвале 16).

Заявы, высланыя пасьля 18 чэрвеня 1928 г., згодна з вышэйадзначаным ня будуць задаволяны.

КАМІТЭТ.

СІРОТКІ.

Маці памёрла.. сіротачак дзетак
Пакінула бедных, малых!
Бацька іх першай, яшчэ перад летак
Пайшоў на той сьвет... Нямашака ў іх
Ні таткі, ні мамкі сваіх..

Пад вечар у летку малюсенькіх двое
Бягуць на магілкі, дзе крыжык стаіць
Дзе татачка і мамачка родныя сьпяць,
На гэту магілку сіроткі абое
Вяночкі з валошкі і румянку нясуць.

Прынесьлі.. Зложылі... І крыж цалавалі.
Кленкнулі . І буйныя сьлёзы ўпалі
На кветкі, што зранку на полі зьбіралі,
Вяночкі для таткі і маткі сплялі,
Для родненькіх шчыра яны працавалі
І кожную кветку сьлязамі зьлівалі.

Да маўклівых магілак яны прыпадалі,
Сырую зямліцу, як маць цалавалі,
Бо ў гэтай зямліцы, што прыклад ляжыць,
Іх шчасьце, іх радасьць, іх сонейка сьпіць.

Сьпяшаюць да дому, бо ноч надыходзе,
На небе сярпком узыйшоў маладзік,
Маленькім сіроткам вялікае гора,
Бо ласкі бацькоўскай няма ўжо для іх.

І часта да магілак сіроткі бягуць,
Каб тату і маму ўгледзіць ідуць,
Сказаць ім пра гора, сірочы свой лёс..
І змокнуць магілкі з дзяціных тых сьлёз..
А там на магілках, дзе кветкі растуць,
Бацькі сваіх дзетачак цёагляча ждуць..

Віктор Шаг.

Клецкая Коэдукацыйная Беларуская Гімназія

прырода—матэматычнага тыпу

адкрыта прыймо вучняў ў I, II, III, IV, V, VI і VII клясы

Заявы аб прыйме вучняў падаюцца ў канцэлярыі гімназіі — М. Клецк, 2-я Татарская, 4 (можна падаваць поштай).

Да заявы трэба далучыць:

1) мэтрыку аб нараджэньні вучня,
2) пасьведчаньне аб адукацыі,
3) пасьведчаньне аб прышчэпе воспы.

У I клясу прыймаюцца дзеці ў веку $9^1/_2$ да $11^1/_2$ гадоў.

Скончыўшыя 7-х аддзелавыя паўшэхныя школы і добра скончыўшыя 6-ць аддзелаў гэтых школ прыймаюцца у IV клясу.

З пачаткам школьнага году пры гімназіі мае быць арганізаваны вучнеўскі інтэрнат.

Аб дню прыймовых экзаменаў і пачатку заняткаў будзе абвешчана асобна.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Радашкоўская

8-х клясовая коэдукацыйная Беларуская Гімназія гуманістычнага тыпу падаець да ведама, што заявы аб прыйме ў-ва усе клясы можна складаць у канцэлярыі Гімназіі што-дня, апрача дзён сьвяточных, ад 12-ай да 14 гадзіны, або прысылаць па пошце на наступны адрэс:

m. Radoszkowicze, pow. Mołodeczański Plac Kościelny 2.

Да заявы трэба далучыць мэтрыку нараджэньня і, калі ёсьць, дакумэнт аб папярэдняй адукацыі.

Уступныя экзамены ў восень адбудуцца ў дні ад 29 жніўня да 10 верэсьня б. г.

Апошняя станцыя па чыгунцэ — Аляхновічы (Olechnowicze), ад Радашковічаў 8 кілёметраў.

ДЫРЭКЦЫЯ

У сяле Гародзьках, пав. Валожынскі, ваявод. Навагр., **ЗДАЕЦЦА Ў АРЭНДУ ДОМ З КРАМКАЙ**, якая мае права на тытунёвую концэсыю. Ад чугуначнай станцыі ½ кілём. Дом мае 7 пакояў. Пры доме сад і рэчка з возярам. Зварачывацца да **З. П. Осіповіча.**

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі.

Друк. І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9.

Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.